1. Президенту Республики Беларусь Лукашенко А.Г.
   220016, г.Минск, ул. К.Маркса, 38
2. Совет Министров Республики Беларусь
   220010, г. Минск, ул. Советская, 9
3. Совет Республики
   Национального собрания Республики Беларусь
   220016, г.Минск, ул. Красноармейская, 9
4. Палата представителей Национального собрания Республики Беларусь
   220010 г. Минск, ул. Советская, 11
5. ГНУ «Институт истории Национальной академии наук Беларуси»
   220072, г. Минск, ул. Академическая, 1
6. Редакция газеты «Комсомольская правда в Беларуси»
   220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б, к. 401
   kp@phkp.by (направлена электронная копия)
7. Редакция газета «Звязда»
   220013 г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, 10/а
   zvarot@zviazda.by (направлена электронная копия)
8. Редакция газеты «Аргументы и факты в Беларуси»
   220013, г. Минск, ул. Б.Хмельницкого, 10/а, 205
   aifcontact@aif.by (направлена электронная копия)
9. Редакция газеты «Советская Белоруссия»
   220013 г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, 10/а
   pisma@sb.by (направлена электронная копия)
10. Редакция газеты «Наша ніва»
    220050, Минск, а/я 537
    nn@nn.by (направлена электронная копия)
11. «Радыё свабода» в Беларуси(http://www.svaboda.org/)
    radiosvaboda@gmail.com
12. Белорусский портал TUT.BY (http://www.tut.by/)
    nn@tutby.com
13. Onliner.by (https://www.onliner.by/)
    info@onliner.by

---

Веремея Руслана Валентиновича
[redacted]
ruslan.veramey@gmail.com
+375-29-508-27-83 (МТС)
+375-29-325-90-77 (Velcom)

Направляю в Ваш адрес обращение по поводу действия Указа Президента Республики Беларусь от 14 декабря 2015 г. № 485 «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў» в двух экземплярах на белорусском (на 7 листах) и русском (на 8 листах) языках.

06.04.2016 Р.В.Веремей

Паважаны Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў, дэпутаты Савета Рэспублікі і Палаты Прадстаўнікоў, а таксама кіраўніцтва Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук, спадары археолагі, журналісцкая супольнасць і ўсе неабыякавыя да гісторыі Бацькаўшчыны грамадзяне!

Звяртаюся да Вас з нагоды дзеяння Ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2015 г. № 485 "Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў", які набыў законную сілу 18 сакавіка гэтага года.

Указ №485 пазіцыянаваўся як спроба змагацца з "чорнымі капальнікамі". Але ці па "чорных капальніках" ён ударыць у першую чаргу?

Бясспрэчна, што неабходнасць падобнага Ўказа наспела даўно, але ў дадзенай фармулёўцы Ўказ (як і іншыя заканадаўчыя акты, што былі распрацаваныя ў развіццё Ўказа №485 і ўжо набылі законную сілу) ставіць пад пагрозу не толькі саму працу па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, але і пакідае шмат пытанняў і заўвагаў наконт таго, як меры Ўказу №485 будуць прымяняцца на практыцы ў дачыненні да калекцыянераў, аматараў прыборнага пошуку і аматараў гісторыі роднага краю.

Прапісаныя ва Ўказе азначэнні "пошук", "археалагічны артэфакт", "археалагічны аб'ект" нават прафесійнага юрыста прымушаюць задумацца, як Указ будзе прымяняцца на практыцы. Напрыклад, калі чалавек глядзіць сабе пад ногі і мэтанакіравана шукае "артэфакт", то ён ужо здзяйсняе "пошук". А калі ён візуальна знаходзіць "артэфакт", так бы мовіць, немэтанакіравана, то гэта ўжо выпадковая знаходка. Варыянт прыборнага пошуку прадметаў, якія не з'яўляюцца артэфактамі, ва Ўказе ўвогуле не разгледжаны, а з гэтага вынікае, што нават калі хтосьці шукае выключна савецкія манеты, а яму трапляецца больш старая манета, то ён ужо — парушальнік закону. Як у такой сітуацыі даказваць адсутнасць намеру шукаць артэфакты — невядома. Ды і само паняцце "археалагічны артэфакт" выклікае не менш пытанняў, бо, згодна з фармулёўкай ва Ўказе, прадмет адначасова павінен адпавядаць некалькім крытэрыям, якія звычайнаму чалавеку вызначыць без дапамогі эксперта немагчыма (узрост знаходкі; гістарычная, мастацкая, культурная ці навуковая каштоўнасць; крытэрыі для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці). На каго разлічаны такія расплывістыя азначэнні, якія можна трактаваць настолькі адвольна, што Закон ператвараецца, як кажуць у народзе, ў дышла: як павярнуў, так і выйшла? У дадатак любое поле, дзе быў знойдзены "археалагічны артэфакт", аўтаматычна ператвараецца ў "археалагічны аб'ект"! Улічваючы багатую гісторыю нашай краіны, пасяўная кампанія можа й не пачацца, бо на кожным полі знойдзецца пара-тройка такіх "археалагічных артэфактаў", а далей згодна з Указам поле павінны абследаваць адпаведныя спецыялісты. Няўжо ў будучыні плануецца ігнараваць заканадаўчую забарону на земляныя работы ў межах "археалагічных аб'ектаў"? Ці потым за пашкоджанне аб'екта будуць штрафы выпісваць? З такім падыходам аграрыі хутчэй знаходкі схаваюць альбо "не заўважаць", чымся будуць зрываць планы пасяўной кампаніі.

Відавочна, што Ўказ №485 рыхтаваўся гісторыкамі і археолагамі, якія вырашылі цалкам падмяць пад сябе ўсю працу па вывучэнню і захаванню нашай гістарычнай спадчыны, прыкрываючыся нібыта сусветным досведам па гэтаму пытанню, ставячы ў прыклад заканадаўства краінаў, дзе прыборны пошук знаходзіцца пад забаронай. Пры гэтым цалкам ігнаруецца досвед краінаў, якія паставілі аматараў прыборнага пошуку на службу афіцыйнай археалогіі. Напрыклад, у Вялікабрытаніі толькі за першы год сумеснай працы афіцыйнай навукі і аматараў прыборнага пошуку было знойдзена 57,5 тысяч артэфактаў! І гэта толькі за год! Наступныя гады прыносілі яшчэ больш знаходак. Былі адкрытыя шматлікія скарбы і новыя археалагічныя помнікі, пра якія афіцыйная навука нават не здагадвалася!

Што можа супрацьпаставіць беларуская навука? Мажліва, Вам невядома колькасць беларускіх археолагаў. Іх каля паўсотні. 50 чалавек бяруць на сябе місію выратавання гістарычнай спадчыны. Хоць і самі прызнаюць, што не могуць даследаваць нават тыя аб’екты, якія здаўна вядомыя. Што ўжо казаць пра звычайныя сельскагаспадарчыя палеткі, якія акрамя механізатараў наўрад ці калі-небудзь убачаць іншых людзей, не тое што археолагаў. Па даволі простым прычынам: археолагаў мала, зарэгістраваных археалагічных аб’ектаў шмат, а на палетках, якія штогод апрацоўваюцца, археалагічныя аб’екты, калі яны там ёсць, ўвогуле не адкрытыя! Хіба археолагі будуць праводзіць раскопкі там, дзе археалагічных аб’ектаў, магчыма, няма ўвогуле, маючы значны спіс недаследаваных аб’ектаў? Як мінімум, не ў гэтым стагоддзі.

Археолагі любяць казаць, што, калі нешта праляжала ў зямлі пару стагоддзяў, то і пару гадоў паляжыць, нічога з ім не стане. Гэта альбо мэтанакіраваная хлусня, альбо прафесійная некампетэнтнасць! Раскопваючы на некалькі метраў углыб, яны, відавочна, забыліся, як выглядаюць знаходкі на глыбіні пары дзясяткаў сантыметраў! Хімічныя ўгнаенні, якія штогод, а то і два разы на год, рассыпаюцца на палях, з’ядаюць метал з астранамічнай хуткасцю! Да таго моманту, як навукоўцы на такім полі з’явяцца, шукаць прыйдзецца сапраўды ўсляпую. Замест таго, каб наладзіць аператыўны збор інфармацыі, археолагі хочуць забараніць любы пошук, даходзіць нават да абсурду – забараняецца візуальны пошук, гэта значыць, калі мэтанакіравана глядзець сабе пад ногі і знайсці артэфакт, можна патрапіць пад адміністратыўную адказнасць з вялізным па беларускім меркам штрафам — да 50 базавых велічынь! Спадзяюся, што прыбор, якім праводзіўся пошук, — вочы — не будуць канфіскоўвацца, як гэта прадугледжана праектам паправак у Кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях.

Акрамя грандыёзных планаў па даследаванню тэрыторыі Беларусі, археолагі праводзяць раскопкі, пішуць навуковы працы, а таксама займаюцца археалагічным наглядам падчас будаўніцтваў і земляных работ. У планах — праца на добраахвотных пачатках у камісіях па рэгістрацыі археалагічных артэфактаў з прыватных калекцый. 50 археолагаў хочуць паспець усюды. І да чаго гэта прыводзіць па факту? Будоўлі ў гістарычных цэнтрах гарадоў праводзяцца “пад наглядам”, замест планавых археалагічных работ. Гэта пытанне фінансаў і часу. Аніякі забудоўшчык не будзе марнаваць шмат часу на даследаванні, паколькі мае зацверджаны план будаўніцтва. Любая затрымка будоўлі — гэта вялізныя фінансавыя страты. Якая ўжо тут гістарычная спадчына, калі пытанне ідзе на мільярды рублёўстратаў. Чаму ў такіх выпадках афіцыйная навука ахвяруе нашай спадчынай дзеля інтарэсаў інвестара ці забудоўшчыка? А колькі будоўляў праводзіцца ўвогуле без археалагічнага нагляду? Некаторым за гэта выпісваюць штрафы, пра некаторых нават не ведаюць. Колькі помнікаў гісторыі і культуры было знішчана сельскай гаспадаркай, будаўніцтвам дарог і іншых аб’ектаў?! А праблема, аказваецца, не ў тым, што археолагаў катастрафічна не хапае, а ў тым, што па калгасным палям ходзяць людзі з металадэтэктарамі.

Аналізуючы канцэпцыю археалагічнага нагляду, нельга не заўважыць, што ва ўмовах вострай зацікаўленасці інвестараў і забудоўшчыкаў у тэрмінах будаўніцтва ў такім “наглядзе” ёсць вялізная прастора для карупцыі. Хто ведае, у якую суму будзе ацэнены дакумент аб адсутнасці археалагічнага помніка на месцы будучай будоўлі, каб гэтая будоўля не спынялася. У краіне, дзе вялікая ўвага надаецца барацьбе з карупцыяй, стварэнне ўмоваў для гэтай самай карупцыі выглядае не іначай як злачынства. Хто можа пракантраляваць такіх наглядчыкаў? Хто з’ўляецца кампетэнтным экспертам, як не самі археолагі, што ажыццяўляюць нагляд? Калі

пытанне ідзе на мільярды рублёў, спадзявацца толькі на сумленнасць археолагаў з зарплатамі ў некалькі мільёнаў — гэта патэнцыяльна небяспечна. Сярод людзей сумленных могуць знайсціся і не зусім чыстыя на руку. Законы павінны прадбачваць такія магчымасці і папярэджваць іх. Але хто рыхтуе законы ў галіне гісторыка-культурнай спадчыны? Самі археолагі…

А чым могуць пахваліцца археолагі ў плане знаходак? Рэпартаж тэлеканала “Белсат” з раскопак у гродзенскім замку ўразіў тым, што ў топ-10 адкрыццяў трапілі маленькія каменныя шарыкі ад сярэднявечнай гульні і свінцовае рыбацкае грузіла. Я разумею, што археолагі працуюць сістэмна і планамерна, але ў замку з такой гісторыяй зрабіць такія адкрыцці!.. У такім выпадку не выклікае здзіўлення той факт, што ў нашых музеях такія прымітыўныя экспанаты, а экспазіцыі не абнаўляюцца гадамі. Дарэчы, пытанні да музейнай справы заслугоўваюць асобнай увагі, пачынаючы ад зместу экспазіцый і скончваючы сапраўднасцю выстаўленых экспанатаў і наяўнасцю артэфактаў у запасніках: не так даўно паведамлялася аб знікненні шэрагу экспанатаў з запаснікаў, пасля чаго пачалася глабальная інвентарызацыі і праверкі, якія, дарэчы, праводзяць супрацоўнікі музеяў, дзе і адбылося знікненне экспанатаў…

Археолагі з абурэннем і нейкай нават зайздрасцю адзначаюць, што на розных інтэрнэт-форумах і аўкцыёнах аматары прадаюць вельмі рэдкія, а часам і невядомыя артэфакты. Тое, што такія знаходкі ідуць у абыход навукі, безумоўна, дрэнна. Але ўзнікае пытанне: як аматары прыборнага пошуку на невядомых перапаханых палях робяць больш цікавыя адкрыцці, чымся прафесіяналы ў гістарычных цэнтрах гарадоў ды мястэчак?! Як так? Ці ўсе знаходкі трапляюць ў выніковыя справаздачы і далей у музеі? Па тэлеканалу БТ-1 трансліраваўся рэпартаж, у якім на раскапаных будаўнічай тэхнікай мясцінах каля нейкай царквы аматары прыборнага пошуку лёгка знаходзілі манеты часоў Рэчы Паспалітай. А дзе ў гэты момант былі археолагі? Абмежаваліся “наглядам”? Ці ўвогуле не палічылі неабходным займацца раскопкамі ў такім месцы? Калі гэта быў “нагляд”, то, відавочна, эфектыўнасць такога метаду проста аніякая. Ці афіцыйную навуку цікавяць толькі курганы ды гарадзішчы больш ранніх часоў? Тады чаму злодзеямі паказваюцца людзі, якія фактычна выратоўваюць з небыцця артэфакты нашага мінулага?

Нельга адмаўляць і таго факту, што аматары прыборнага пошуку наносяць пэўную шкоду гістарычнай спадчыне. Але гэта абумоўлена выключна тым, што адсутнічала элементарная арганізацыя, сістэма ўліку і фіксацыі месца знаходак, а таксама кантроль за абаротам знаходак. Замест эфектыўнага супрацоўніцтва археолагі вырашылі манапалізаваць працу па захаванню гістарычнай спадчыны, бо прасцей забараніць металапошук увогуле, чымся яго арганізаваць.

Часта даводзіцца чуць ад прадстаўнікоў афіцыйнай навукі, што да Ўказа №485 не было аніякіх магчымасцяў змагацца з так званымі “чорнымі капальнікамі”. Няўжо навукоўцам было невядома, што ў Кодэксе аб адміністратыўных правапарушэннях ёсць глава 19 — “Адміністратыўныя правапарушэнні ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны”? Там змешчаны цэлых 7 (сем!) артыкулаў! У іх усё дакладна прапісана! І Крымінальны кодэкс ніхто не адмяняў. А там — артыкулы з 344 па 347 уключна. 4 (чатыры!) артыкулы з крымінальнай адказнасцю! Артыкулы закранаюць і пашкоджанні, і знішчэнне гісторыка-культурнай каштоўнасці альбо аб’ектаў, якім такі статус толькі можа быць нададзены! І гэта без уліку артыкулаў за незаконны абарот зброі і выбуховых рэчываў!

Але ці шмат парушальнікаў было прыцягнута да адказнасці? Дробязь! Праваахоўныя органы больш увагі надзялялі і надзяляюць парушальнікам, якія звязаныя з незаконным абаротам зброі і выбуховых рэчываў. Гэта цалкам лагічна і

зразумела: пашкоджанне археалагічнага помніка ўяўляе значна меншую грамадскую небяспеку, чымся зброя і выбухоўка ў руках злодзея. Але медаль мае і адваротны бок: шмат аматараў прыборнага пошуку, якія выпадкова знайшлі выбухова-небяспечныя прадметы і паведамілі ў міліцыю аб небяспечнай знаходцы, выканаўшы грамадзянскі і чалавечы абавязак, аўтаматычна ставяцца на прафілактычны ўлік, як патэнцыяльна небяспечныя грамадзяне, да некаторых з іх пазней прыходзяць праверкі падчас спецаперацый “Арсенал”. Такая пільная ўвага супрацоўнікаў міліцыі зразумелая, але гэта прыводзіць да таго, што большасць аматараў прыборнага пошуку проста топяць небяспечныя знаходкі ў балотах альбо вадаёмах ці проста закапваюць глыбей. Хто ведае, калі б і ў гэтай галіне было наладжана супрацоўніцтва з аматарамі, магчыма трагедыя ў Вешаўцы, дзе ад снарада часоў Вялікай Айчыннай вайны загінулі дзеці, і не адбылася б увогуле: дзеючых сапёраў у нас не нашмат больш, чымся дзеючых археолагаў, а вайна закранула кожны лапік беларускай зямлі.

Асобную ўвагу трэба надаць пытанню калекцыянавання. Калекцыянеры, каб адвесці ўдар ад сябе, стараюцца зараз адмежавацца ад аматараў прыборнага пошуку. Хоць цалкам лагічна, што рынак падобнага антыкварыяту і артэфактаў папаўняецца ў асноўным дзякуючы гэтым самым аматарам. Попыт, як кажуць, нараджае прапанову. Заканадаўства ў галіне калекцыянавання наогул распрацавана вельмі слаба. Аб чым можна казаць, калі калекцыянер, які набывае, напрыклад, манету вартасцю ў адну капейку Расійскай Федэрацыі, аўтаматычна падпадае пад адказнасць за незаконныя валютна-абменныя аперацыі! Добра, калі вядома ,што манета ўсё яшчэ знаходзіцца ў абароце, а калі гэта манеты Уганды ці Кеніі? Там яны могуць таксама быць у абароце. А манеты ЗША? Цэнт 1870-га году працягвае заставацца законным плацежным сродкам да гэтага часу! А манеты іншых краінаў, старэйшыя за 120 гадоў, набытыя за мяжой, хіба маюць дачыненне да гістарычнай спадчыны Беларусі? Згодна з Указам — маюць, а па факту?

Каб вярнуць “археалагічныя артэфакты” з прыватных калекцый у навуковы абарот, плануецца стварыць спецыяльны рэестр. Вельмі ўхвальная ініцыятыва. А як жа яе рэалізуюць? Задарма, што, безумоўна, радуе, трэба зарэгістраваць “артэфакт”, перадаўшы яго археалагічнай камісіі разам з двума фотаздымкамі і заявай. А калі калекцыя налічвае не адну сотню, а то і тысячу аб’ектаў? У XXI стагоддзі абсурдна выглядае патрабаванне рабіць па два папяровыя фотаздымкі, якія задарма ніхто вам не зробіць! І колькі часу спатрэбіцца на рэгістрацыю? Згодна з Указам — да канца года павінны завершыць. А камісіі да гэтага часу не створаныя. У дадатак, ніхто не дае аніякіх гарантый захавання перададзенага аб’екта. Дзе і як ён будзе захоўвацца? Хто за яго будзе адказваць? Сакратар камісіі? Сам факт наяўнасці рэестра ставіць пад пагрозу ўладальнікаў аб’ектаў. Хто ведае, ці не патрапіць інфармацыя з рэестра злачынцам, якія адразу будуць ведаць да каго і за чым ісці? Такія прэцэдэнты ўжо былі! А можа, будзе яшчэ весялей: прызнаюць аб’ект гістарычнай каштоўнасцю, потым правядуць праверку, як захоўваецца гэтая гістарычная каштоўнасць, выявяць парушэнні, выпішуць штраф і канфіскуюць! Хто ў цвярозым розуме пойдзе рэгістраваць свае калекцыі? Іх прасцей вывесці ў тую ж Расію ці па старой завядзёнцы закапаць да лепшых часоў! Такімі метадамі навукоўцы хацелі вывесці з цяню прыватныя калекцыі? Ды гэта толькі глыбей іх у цень заганіць!

Канчаткова заблытаў сітуацыю з калекцыянаваннем адказ Міністэрства культуры на зварот “Беларускага рэспубліканскага грамадскага аб’яднання калекцыянераў” з нагоды дзеяння Ўказа №485. Міністэрства культуры прыводзіць паняцце “прадмет антыкварыяту”, да якога адносяцца, цытую, “культурныя каштоўнасці, створаныя больш 50 год назад адносна да даты прыёму на камісію (творы жывапісу, графікі, скульптуры, даўнейшая мэбля, прадметы дэкаратыўна-

прыкладного мастацтва, унікальныя і рэдкія музычныя інструменты, старадаўнія манеты, ордэны, медалі і іншыя прадметы калекцыянавання)”. Гэтаксама Міністэрства культуры сцвярджае, што Ўказ №485 “не закранае пытанні калекцыянавання прадметаў антыкварыяту”. Вось, як кажуць, і прыехалі: дзе тая мяжа паміж “археалагічным артэфактам” і “прадметам антыкварыяту”? Пра рэгістрацыю прадметаў антыкварыяту ва Ўказе не сказана ані слова! Хто будзе прымаць рашэнне аб тым, з’яўляецца манета ці іншая рэч артэфактам або антыкварыятам? І хто будзе потым вінаватым?

Прадстаўнікі афіцыйнай навукі, з якімі прыходзіцца весці завочныя дыскусіі ў СМІ, не могуць даць дакладных адказаў на вышэй узгаданыя пытанні. Археолагі расказваюць пра раскопкі “чорнымі капальнікамі” курганаў ды іншых помнікаў археалогіі, пра продаж прадметаў, звязаных з нашай гісторыяй. Так, абарот прадметаў гісторыі і культуры трэба кантраляваць. А са злачынцамі, якія парушаюць заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, тымі самымі “чорнымі капальнікамі”, трэба змагацца па закону, як і з браканьерамі, нецвярозымі кіроўцамі, карупцыянерамі. Абсурдна было б, калі б ўсім забаранілі паляванне і рыбалку праз наяўнасць браканьераў, альбо кіраванне аўтамабілем праз наяўнасць п’яных за рулём, альбо распусцілі ўвесь апарат чыноўнікаў, бо сярод іх трапляюцца карупцыянеры. А ў дачыненні да аматараў гісторыі паступілі менавіта так: усіх агулам зрабілі злачынцамі, пакінуўшы толькі за афіцыйнай гістарычнай навукай права на вывучэнне нашай агульнай гісторыі.

Гісторыкі любяць параўноўваць знаходкі ў зямлі з кнігай, маўляў, вырві некалькі “старонак” з яе — і “кніга” будзе няпоўнай. Але хіба лепей будзе, калі гэтыя “старонкі” проста згніюць у зямлі? Ці не лепей усё-ткі аб’яднаць намаганні аматараў і археолагаў? Тысячы аматараў па ўсёй Беларусі маглі б займацца разведкай, фарміруючы такім чынам мапу размяшчэння знаходак, якую потым маглі б выкарыстоўваць археолагі для планамерных раскопак.

Замест гэтага археолагі заклікаюць аматараў прыборнага пошуку выкінуць свае прыборы і пайсці простымі валанцёрамі з “пэндзлікамі і зубачысткамі” на археалагічныя раскопкі, маўляў, без валанцёраў раскопкі не адбудуцца, бо 50 археолагаў са студэнтамі гістарычных спецыяльнасцяў адны не справяцца. А каб канчаткова пазбавіць магчымасці легальна працягваць пошук з прыборам, прапісалі ў законах патрабаванні: вышэйшая адукацыя па спецыяльнасці “Археалогія” ці “Гісторыя (Археалогія)”; валоданне навуковымі практычнымі ведамі, неабходнымі для правядзення археалагічных даследаванняў і падрыхтоўкі навуковай справаздачы аб выкананых археалагічных палявых работах; мець практыку ўдзелу ў археалагічных даследаваннях на працягу не менш чым два гады ў сукупнасці незалежна ад тэрмінаў перапынку. Адным словам, напісалі: пошукам займацца можам толькі мы, афіцыйныя археолагі. Цынічна пры гэтым выглядала заява ў рэпартажы на БТ-1 аднаго навукоўца, які казаў, што аматары прыборнага пошуку змогуць заключаць дамовы з музеямі і Інстытутам гісторыі. Вядома, змогуць! Калі будуць адпавядаць вышэйузгаданым патрабаванням, аб чым навуковец тактычна змаўчаў альбо проста не ведаў.

Ёсць яшчэ пытанне наконт патрабавання перадаваць ўсе знаходкі дзяржаве. Што будуць рабіць гісторыкі з тысячамі, а то і мільёнамі манет і іншых металічных прадметаў, тонамі керамікі і іншымі артэфактамі? Складзіраваць у запасніках? Выкарыстоўваць для напісання манаграфій накладам 50 асобнікаў? У вольным доступе вельмі мала літаратуры па гісторыі бацькаўшчыны. Дзе ж яна ўся падзелася? Для каго пішуцца кнігі? Для саміх навукоўцаў? Навука дзеля навукі? Ці ў будучыні Інстытут гісторыі плануе стаць манапалістам па рэалізацыі артэфактаў для прыватных

калекцыянераў? Гэта ўжо будзе самым сапраўдным блюзнерствам. Варта адзначыць, што ў мясцовай прэсе (Мсціслаўская раённая газета “Святло кастрычніка” ад 2 красавіка 2016г.) пішуць, што ў выпадку, калі знаходка, перададзеная камісіі, не будзе мець гістарычнай каштоўнасці, яна будзе вернута аўтару знаходкі альбо ў музей. Пра такія працэдуры ані ва Ўказе №485, ані ў наступных заканадаўчых актах не сказана нічога. Яшчэ адно пытанне без дакладнага, з пункту гледжання законаў, адказу.

Падсумоўваючы вышэй сказанае, усё тое, што набалела (бо за гісторыю Радзімы душа баліць не толькі ў археолагаў), хочацца выступіць не толькі з крытыкай, але і з канструктыўнымі прапановамі (дарэчы, хацелася б яшчэ ведаць, чаму Ўказ аб захаванні нашай агульнай спадчыны не абмяркоўваўся з грамадствам, якому гэтая спадчына фактычна й належыць).

Сутнасць прапаноў.

1. Адмяніць Указ №485 і замяніць яго на іншы, які будзе не толькі адлюстроўваць інтарэсы афіцыйнай археалогіі, але таксама і аматараў гісторыі, пры гэтым робячы прыярытэтным кірункам не забеспячэнне працай археолагаў, а даследаванне і захаванне гістарычнай спадчыны.

2. Улічваючы п.1, не прымаць апублікаваны праект паправак ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

3. Стварыць сапраўдныя кампетэнтныя Археалагічныя камісіі, а не так, як гэта робіцца зараз — з чыноўнікаў выканкамаў, якія, мажліва, да гістарычнай навукі не маюць аніякага дачынення. Камісіі гэтыя павінны працаваць не на добраахвотных пачатках, як прапісана зараз у Палажэнні аб археалагічных камісіях, а на прафесійнай аснове, бо камісія — гэта першы і самы важны этап, з якога будзе пачынацца шлях любой знаходкі ў афіцыйную навуку. Камісіі павінны займацца аналізам выяўленых артэфактаў, іх сістэматызацыяй, ўлікам і пры неабходнасці ацэнкай.

4. Распрацаваць і ўвесці ў дзеянне Палажэнне аб пошуку артэфактаў, у якім прадугледзіць не такія жорсткія, як гэта зроблена зараз, патрабаванні да шукальнікаў. Асноўнымі забаронамі падчас пошуку павінны быць: пошук на археалагічным аб’екце і ў яго ахоўнай зоне; пашкоджанне пасеваў; утойванне артэфакта і месца яго знаходкі або падача недакладных звестак аб месцы знаходкі; пошук на глыбіні, якая перавышае 0,5 метра; выкарыстанне глыбінных металадэтэктараў і геарадараў; парушэнне культуры пошукавых дзеянняў (маю на ўвазе набалелае пытанне незакапаных ям); выкарыстанне будаўнічай тэхнікі; незаконны абарот археалагічных артэфактаў.

Самы просты шлях у вырашэнні гэтага пытання — адаптаваць заканадаўства Вялікабрытаніі ў галіне пошуку артэфактаў, дзе ў падрабязнасцях распісана, што і як трэба рабіць і да каго звяртацца ў выпадку выяўлення артэфакта. Дадаткова аматараў прыборнага пошуку можна прыцягваць да маніторынгу стану вядомых археалагічных аб’ектаў, прыпынення правапарушэнняў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама для тэрміновых археалагічных разведак месцаў, адведзеных пад будаўніцтва ці правядзенне земляных работ (чалавек з металадэтэктарам, відавочна, зможа знайсці больш, чымся археолаг-наглядчык візуальным пошукам).

5. Стварыць пры Інстытуце гісторыі, музеях (ці без іх удзелу) грамадскія аб’яднанні аматараў прыборнага пошуку, с платай адпаведных сяброўскіх унёскаў, якія будуць паступаць у Археалагічны Фонд (гл. п.7), і заключэннем афіцыйнай дамовы, дзе будуць прапісаны правы і абавязкі бакоў, а таксама адказнасць за магчымыя парушэнні.

6. Стварыць адзіную, пад кантролем дзяржавы, інтэрнэт-пляцоўку для правядзення аўкцыёнаў па продажы артэфактаў і антыкварыяту. Прадугледзіць

адлічэнне пэўнага працэнту ад сумы ўгоды, як гэта практыкуецца на інтэрнэт-аўкцыёнах, у Археалагічны Фонд (гл. п.7). Права першачарговавага выкупу прадмета пакінуць за дзяржаўнымі навуковымі і культурнымі установамі па аб’ектыўнаму кошту. Іншыя спосабы продажу дазволіць толькі пры наяўнасці адпаведных дакументаў аб тым, што артэфакт унесены ў рэестр і дзяржаўныя навуковыя і культурныя ўстановы не маюць намер набываць яго ва ўласнасць. Атрыманы ад продажу даход абкладаць падаходным падаткам. Трэба прадугледзіць і магчымасць бясплатнай перадачы артэфактаў у музеі.

7. Стварыць Археалагічны Фонд, у якім будуць акумулявацца фінансавыя сродкі спонсараў, мецэнатаў, унёскі аб’яднанняў аматараў прыборнага пошуку, працэнт ад угодаў па продажы артэфактаў і антыкварыяту. За кошт сродкаў Фонду можна будзе набываць артэфакты, фінансаваць дзейнасць Археалагічных камісій, аўкцыёнаў і правядзенне археалагічных даследаванняў.

8. Арганізаваць рэгістрацыю прыватных калекцый такім чынам, каб былі гарантаваны бяспека і па часоваму захаванню артэфактаў у камісіях, і па абароне інфармацыі аб уладальніку артэфакта. Доступ да такога інфармацыйнага рэестра павінен быць істотна абмежаваны і трымацца пад кантролем, мажліва, нават КДБ. Шэраговым навуковым супрацоўнікам павінна быць даступна інфармацыя толькі пра сам артэфакт, і ў аніякім разе інфармацыя пра яго ўладальніка. Паколькі гэта будзе даволі цяжка рэалізаваць, на першапачатковым этапе мэтазгодна рэгістрацыю калекцыі зрабіць добраахвотнай, але пры гэтым продаж артэфактаў ажыццяўляць згодна з рэкамендацыямі п.6.

9. Апошнім пунктам падам прапановы пра пакаранне. Шмат якія супрацьпраўныя дзеянні ў нас ужо прапісаны ў кодэксах, трэба толькі прымусіць іх працаваць. Сярод астатніх правапарушэнняў варта прапісаць адказнасць за незаконны абарот ці ўтойванне артэфактаў, парушэнне правілаў пошуку (гл. п.4), нявыплату падаткаў, разгалошванне ці перадача трэцім асобам інфармацыі пра ўладальнікаў артэфактаў, немэтанакіраванае выкарыстанне сродкаў Археалагічнага Фонду. Астатняе — згодна з фармулёўкамі новай рэдакцыі Закону “Аб удасканаленні аховы археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў”.

Міністр культуры Вялікабрытаніі Дэвід Лэммі, адзначаючы важкі ўнёсак аматараў у развіццё навукі, назваў іх “няўслаўленымі героямі нацыянальнай спадчыны”. Чаму ж у Беларусі ўсіх аматараў залічылі да злачынцаў? Хіба ў нас людзі горшыя? Калі глядзець аб’ектыўна на сітуацыю, то толькі сумеснымі намаганнямі аматараў гісторыі і прадстаўнікоў афіцыйнай навукі можна будзе наладзіць паспяховую і плённую працу ў галіне аховы нашай гісторыка-культурнай спадчыны. Ніхто не збіраецца пазбаўляць археолагаў працы. Паверце, пры належнай арганізацыі ў іх працы будзе значна больш, чым зараз, а таксама ва ўмовах дзеяння Ўказу №485, а знаходкі і прыватныя калекцыі не знікнуць для навукі і не з’едуць у Расію, ды й рынак антыкварыяту і артэфактаў не сыдзе ў цень.

Спадчына ў нас адна на ўсіх, і вялікай памылкай будзе не падпускаць да яе захавання людзей, якія на добраахвотных пачатках сапраўды дбаюць пра нашую гісторыю і культуру. Толькі разам, агульнымі намаганнямі можна будзе даць новы штуршок развіццю гістарычнай навукі, адкрыць невядомыя старонкі нашай гісторыі, павысіць прэстыж прафесіі гісторыка і археолага, і толькі разам можна абараніць нашу спадчыну і даць сапраўдны бой сапраўдным “чорным капальнікам”.

06.04.2016 Р.В.Верамей

Уважаемый Президент Республики Беларусь, Совет Министров, депутаты Совета Республики и Палаты Представителей, а также руководство Института истории Национальной Академии наук, господа археологи, журналистское сообщество и все неравнодушные к истории Отечества граждане!

Обращаюсь к Вам по поводу действия Указа Президента Республики Беларусь от 14 декабря 2015 г. № 485 «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў», который вступил в законную силу 18 марта этого года.

Указ №485 позиционировался как попытка бороться с «черными копателями». Но по «черным копателям» ли он ударит в первую очередь?

Бесспорно, что необходимость подобного Указа назрела давно, но в данной формулировке Указ (как и другие законодательные акты, которые были разработаны в развитие Указа №485 и уже вступили в законную силу) ставит под угрозу не только саму работу по сохранению историко-культурного наследия, но и оставляет много вопросов и замечаний насчет того, как меры Указа №485 будут применяться на практике касательно коллекционеров, любителей приборного поиска и любителей истории родного края.

